**УДК 82.09**

# ПАКАЗ ТРАГІЗМУ ЧАЛАВЕЧАГА БЫЦЦЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ МАСТАЦКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ АПОВЕСЦІ ПРА ВАЙНУ

***Т.Р. БАГАРАДАВА***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Аналізуюцца творы, якія заснаваныя на рэальных падзеях і адносяцца да мастацка-дакументальнай прозы. Прыкладна з 1960-х гадоў мастацкае даследаванне Вялікай Айчыннай вайны як вайны народнай стала для беларускай літаратуры першаснай задачай. Дакументальная літаратура дае больш праўдзівы і аб'ектыўны аналіз сітуацыі. Сведкі спаленых вёсак, блакаднікі, жанчыны-ўдзельніцы ваенных падзей і, нарэшце, дзеці, па лёсах якіх прайшлася вайна, даюць праўдзівы малюнак тагачаснай рэчаіснасці. У дадзенай рабоце аналізуюцца творы пра вайну, што маюць дакументальную аснову: «Я з вогненнай вёскі» (аўтары А. Адамовіч, Я. Брыль. У. Калеснік); «Блакадная кніга» (аўтары А. Адамовіч і Д. Гранін); «У вайны не жаночае аблічча», «Апошнія сведкі», «Цынкавыя хлопчыкі» (аўтар С. Алексіевіч). Вопыт літаратуры паказвае, што адказаць на пытанне – у чым заключаецца сутнасць чалавека – немагчыма без уліку рэальных падзей часу і акаляючых абставін. Аўтары імкнуліся праўдзіва адлюстраваць жудасныя ваенныя падзеі ў розных ракурсах. Літаратура дакумента максімальна поўна выконвае пастаўленыя пісьменнікамі задачы.*

**Уводзіны.** Другая сусветная вайна – самы маштабны і самы крывавы канфлікт у гісторыі чалавецтва. У ёй брала ўдзел шэсцьдзесят адна дзяржава – восемдзесят працэнтаў насельніцтва зямнога шара. Вайна доўжылася шэсць год і забрала, па некаторых звестках, каля шасцідзесяці мільёнаў чалавечых жыццяў. Па-сутнасці, з фашызмам змагалася ўся планета. Арміі краін, што ваявалі, налічвалі прыкладна сто дзесяць мільёнаў чалавек. Фашысты былі не проста апалагетамі вайны, а носьбітамі татальнай ідэі вайны – поўнае знішчэнне пераможанага народа і яго канчатковае знікненне з гістарычнай арэны. Яны выступілі з пэўнай філасофіяй жыцця, галоўным ворагам якой стаў, па словах А. Гітлера, марксізм. Аб'явіўшы бой ўсім прагрэсіўным заваёвам сусветнай цывілізацыі, фашысты пачалі змагацца супраць гуманізму і дэмакратыі. Фашызм абвясціў поўнае падаўленне асобы. Гітлер назваў масы «статкам пустагаловых баранаў», заявіўшы, што немцы павінны забіваць ад трох да чатырох мільёнаў рускіх у год. Зразумела, што пры такіх адносінах да чалавека дадзеная філасофія доўга праіснаваць не змагла.

**Асноўная частка.** Паводле слоў Л. Плоткіна, «…мінулая вайна была вайной асаблівай, незвычайнай у самой сваёй плыні, у самім яе ходзе. Яна была поўная…кантрастаў» [1, с. 11]. Натуральна ўзнікалі праблемы пры атаясамліванні ваенных дзеянняў, ролі чалавека ў ходзе гісторыі.

Беларуская ваенная проза з'яўляецца адметнай часткай не толькі айчыннай літаратурнай спадчыны. «Пра вайну беларусы пішуць, як дышуць. Беларуская ваенная проза – класіка сусветнай літаратуры… Беларуская ваенная проза – ані пафасу, ані цынізму. Толькі праўда. Беларуская ваенная проза – гэта споведзь нацыі, якая вырасла на вайне… Вось адкуль яно, беларускае «абы не было вайны»… Гэта вайна вачыма жаўнера і партызана, жанчыны і дзіцёнка, забойцы і здрадніка. Вайна ў рэжыме рэальнага часу, з гадзіннікам, які цікае ў сэрцы, быццам перад выбухам…» [3, с. 164 – 165].

Прыкладна з 1960-х гадоў мастацкае даследаванне і асэнсаванне Вялікай Айчыннай вайны як вайны народнай на многія дзесяцігоддзі стала для беларускай літаратуры першаснай задачай. Наяўнасць ярка выражанай нацыянальнай адметнасці беларускай літаратуры – яе своеасаблівай «сялянскасці», «народнасці» падкрэслівалі В. Каваленка і М. Тычына. Побач з тым С. Андраюк адзначаў: «… Спасцiжэнне мінулай вайны як вайны народнай рэальнае ў такой ступені, у якой асабістыя веды пісьменніка, яго асабістая памяць будуць «аплоднены» ведамі і памяццю народнай» [2, с. 90]. Рэальную аснову для разваг пра людскую памяць пісьменніку дае ўласны вопыт. Ён павінен вылучаць у народнай памяці галоўнае – праўду, што абапіраецца на рэальныя факты, падзеі, тагачасныя перажыванні.

Вопыт літаратуры паказвае, што адказаць на пытанне – у чым заключаецца сутнасць чалавека – немагчыма без уліку рэальных падзей часу і акаляючых абставін. Як канстатуе Н. Якаўлеў: «Неабходна было знайсці форму ўзаемадзеяння асобы з гістарычнымі абставінамі» [4, с. 131]. Адной з такіх форм адлюстравання стала мемуарная мастацка-дакументальная проза пра вайну – неад'емны і адзін з самых аб'ектыўных жанраў беларускай літаратуры. Жывыя сведкі трагічных падзей, як ніхто іншы, адчувалі рэальны жах вайны і псіхалагічна раскрываліся ў экстрэмальнай сітуацыі. Дакументальная або мастацка-дакументальная кніга пра вайну з'яўляецца канцэнтрацыяй трагічнасці.

Для А. Адамовіча вызначальнай рысай ва ўзнаўленні перажытага стала праца (сумесна з Я. Брылём і У. Калеснікам) над кнігай «Я з вогненнай вёскі…» (1975) і праца (сумесна з Д. Граніным) над «Блакаднай кнігай» (1982). У адным з артыкулаў А. Адамовіч адзначаў: «Літаратура наша ўсё яшчэ на бестэрмі-

новай передавой, якая паступова ператварылася ў передавую і супраць новага ворага, сёння галоўнага, пастаяннага, – супраць вайны, новай і ўсялякай» [5, с. 11]. Пісьменнік нездарма ўзяўся за стварэнне кнігі, заснаванай на дакументальным матэрыяле. Аўтару хацелася максімальна праўдзіва адлюстраваць жудасныя ваенныя падзеі, таму ён скрупулёзна збіраў дакументальныя матэрыялы відавочцаў, адшукваў разам з калегамі ўцалелых жыхароў вёсак, спаленых фашыстамі, запісваў іх аповеды пра беларускія «вогненныя» вёскі, пра перажытую трагедыю. Гэтая кніга была высока ацэнена крытыкай і грамадскасцю, набыла міжнародны рэзананс. Кніга мае ярка выражаны публіцыстычны характар: матэрыял пададзены з выключнай непаўторнасцю, жыццёвасцю, унікальнай праўдзівасцю. «Кніга гэтая, – пісаў Г. Шупенька, – нясе не толькі маральнае ўзрушэнне, але і катарсіс, ачышчэнне душы, успрымаецца як твор высокага трагедыйнага мастацтва, як народная эпапея, з якой паўстае праўдзівая, гераічная душа нашага народа, яго трагедыя і неўміручая веліч…» [6, с. 229].

Даволі працяглы час існавала складанасць у вызначэнні жанру твораў такога кшталту. Калісьці М. Кузняцоў у часопісе «Новый мир», пазней Г. Белая ў «Вопросах литературы», А. Эльяшэвіч у «Звяздзе», звяртаючыся да кніг «Я з вогненнай вёскі», «Блакадная кніга», называлі іх па-рознаму, але ўсе – новым жанрам. Як пісаў М. Тычына, «Вывучэнне пісьменнікамі калектыўнай памяці, запіс «вусных гісторый» адкрываюць шлях для літаратуры, якая намагаецца ўвабраць ў сябе ўсё багацце народнага вопыту, набытага на працягу самай страшнай вайны… Так стварайся новы, невядомы раней жанр літаратуры – мастацкі дакумент, кніга-араторыя, сімфонія, хор (гэтыя і іншыя падобныя па сэнсу назвы жанру згадваліся крытыкай)» [7, с. 337]. Сам А. Адамовіч даў яму наступнае вызначэнне: «Рэпартаж з месца гістарычнай падзеі…» [5, с. 22].

Ва ўступе да твора аўтары акрэсліваюць мэту яго стварэння: «Сваю задачу мы бачылі ў тым, каб зберагчы, утрымаць, як «плазму», невыносную тэмпературу чалавечага болю, неўразумення, гневу, якія не толькі ў словах, але і ў голасе, у вачах, на твары, утрымаць усё тое, што, як паветра, акаляе чалавека, які распавядаў нам, а зараз са старонак кнігі, звяртаецца да чытача – да вас звяртаецца» [8, с. 5].

Пасля выхаду ў свет дадзенага твора ўсесаюзная «ваенная» проза пачала браць шмат элементаў з «вясковай» прозы, перш за ўсё, падкрэслена народную ацэнку – маральную, жыццёвую, моўную. Знішчальны характар вайны, яе глыбокі трагізм, пакуты і гібель дзесяткаў мільёнаў людзей, напружанасць сацыяльна-філасофскіх канфліктаў, што ляжалі ў яе аснове, кантрасты і пераломы ў яе ходзе, маштабнасць наступстваў – ўсё гэта паўплывала на асобу. Дадзены прыём – убачыць вайну вачыма неваеннага чалавека, праз яго ўспрыманне расказаць пра абсурднасць і дзікасць забойства іншых – характэрны для «вясковай» і «ваеннай» літаратуры. Такім чынам, укладваючы ў вусны простых людзей непасрэдныя сведчанні пра падзеі, даючы ім магчымасць ацэнкі акаляючай рэчаіснасці, аўтары зрабілі аповед максімальна праўдзівым і натуральным.

«…У літаратуры аб вайне, – слушна зазначыў П. Дзюбайла, – відавочнай стала агульная тэндэнцыя – больш глыбока раскрываецца драматызм вайны, пісьменнікі ўсё больш звяртаюцца да трагічных з'яў і характараў, трагічнае становіцца галоўнай сферай выяўлення гераічнага, гуманістычнага, антываеннага» [9, с. 34]. Для мастацкай традыцыі А. Адамовіча характэрным стала раскрыццё псіхалогіі чалавека на вайне, спроба знутры пагледзець на трагічнае жыццё чалавека, адзначыць яго глыбінныя межы – гэтаму ў значнай ступені спрыяе дакументалізм і публіцыстычнасць твора: «Я з вогненнай вёскі» – дакументальная трагедыя, кніга-памяць, жывы голас людзей, якія былі спаленыя, забітыя разам з сем'ямі, разам з усёй вёскай і якія жывуць» [8, с. 5].

Да твораў адзначанага жанру належыць і «Блакадная кніга». Натуральным стаў факт, што запісваць аповеды, шукаць дзённікі і лісты таго часу стаў ленінградскі пісьменнік Д. Гранін, які пражыў у горадзе амаль усё жыццё, змагаўся каля яго сцен. Дзіўна іншае – ініцыятарам стварэння такой кнігі стаў менавіта А. Адамовіч. Як зазначае Л. Лазараў, «…Не прафесійная цікавасць – маральны абавязак падштурхнулі Д. Граніна і А. Адамовіча да гэтай цяжкай працы» [10, с. 306].

У пасляваенныя гады пра ленінградскую блакаду было напісана шмат. Маштабы дадзенай трагедыі ўявіць даволі складана. Галоўнай мэтай аўтараў кнігі стала наступная: «Даць магчымасць людзям, што перанеслі невыноснае, расказаць пра гэта…» [10, с. 306]. Адамовіч і Гранін усвядомілі патрэбу блакаднікаў выгаварыцца, распавесці пра набалелае. Блакадная кніга – адна з праяў супраціўлення фашыстам, адна з ахвяр, заплочаных за перамогу: «Уявіць такое чалавек не ў стане, згададца пра гэта немагчыма…» [10, с. 305].

Аўтары «Блакаднай кнігі» нічога не спрошчваюць, не прыфарбоўваюць: расповед ідзе пра спецыяльныя даследаванні, у якіх вывучаўся «вопыт» лагераў, дзе расстрэльвалі і катавалі голадам. Масавае знішчэнне людзей з'яўляецца прэрагатывай жорсткага дваццатага стагоддзя. Пісьменнікаў цікавіць не толькі гістарычная праўда – яны думаюць і пра будучыню, пра тое, што з былога трэба выносіць урокі.

Аўтары адзначаюць: «У гэтай праўды ёсць адрасы, нумары тэлефонаў, прозвішчы, імёны. Яна жыве ў ленінградскіх кватэрах… Чакала ці не чакала вашага наведвання, вашай раптоўнай цікавасці, яна зірне на вас жаночымі ці не жаночымі, але абавязкова немаладымі і абавязкова ўсхваляванымі вачыма,

ацэньваючы…» [11, с. 3]. Кніга мае дзве часткі: у першай паўстае ўсебаковы малюнак жыцця ў горадзе, акружаным вайной. Яе складаюць дзесяткі ўспамінаў блакаднікаў, запісаныя на магнітафон з каментарамі аўтараў, а таксама сведчанні-дакументы, размешчаныя пэўным чынам. Каментары разам з «рэпартажам з мінулага часу» склалі адзіны публіцыстычны твор, у якім ёсць народная памяць пра гады блакады.

Другую частку складаюць дзённікавыя запісы трох чалавек, што зведалі блакаду: вучонага, сталага чалавека Князева Георгія Аляксеевіча, Рабінкіна Юры, шаснаццацігадовага хлопчыка; Ахапкінай Лідзіі Георгіеўны, на руках якой былі ў той час пяцігадовы сын і пяцімесячная дачка. У другой частцы падзеі разгортваюцца ў хранікальнай паслядоўнасці. Дзве дадзеныя часткі, два планы з'яўляюцца арганічным дапаўненнем. Аповеды простых людзей, масавы вопыт – самы цікавы. Доўгі час дакументалістыка да яго не даходзіла, аднак ён запаўняе прабел у мемуарнай мастацка-дакументальнай літаратуры пра вайну.

«Ёсць кнігі, – піша А. Рубашкін, у якіх не фігуральна, а прама суаўтарам становяцца гісторыя, народ: такія, дзе аснова тэксту – сапраўдныя, дакладна зафіксаваныя дакументальныя запісы. Гэта перш за ўсё «Я з вогненнай вёскі..» А. Адамовіча, Я. Брыля, У. Калесніка і «Блакадная кніга» А. Адамовіча і Д. Граніна» [11, с. 300].

Аўтары праяўляюць пачуццё гістарызму – на матэрыяле дзённікаў прасочваюць эвалюцыю героя: павелічэнне шчырасці ў аповедах Князева, аповед пра фактычна загубленае непачатае жыццё Рабінкіна. Да шостага студзеня 1942 года кавалкі з дзённікаў Князева і Рабінкіна мяжуюцца. Абстаноўку да жніўня 1944 года мы ведаем з запісаў Князева. Другая частка ўтрымлівае асабістыя ўспаміны самога аўтара. Пры падрыхтоўцы кнігі пісьменнікі адшуквалі людзей-сведкаў, а таксама дакументы; сустракаліся з былымі блакаднікамі, напрыклад, з сястрой Юры Рабінкіна, якой тады было восем год.

Нельга канстатаваць, што ў другой частцы фігуруюць тры героі: аўтары значна пашырылі дыяпазон агляду. Побач з матэрыяламі дзённікаў утрымліваюцца і іншыя сведчанні: эвакуацыя дзяцей, лёс мастака Філонава і яго прац, дарога жыцця. Кніга ўтрымлівае фатаздымкі мінулых дзён, дзіцячыя малюнкі часоў блакады. На прыканцы кнігі аўтары цытуюць словы з Бібліі пра смяротнасць чалавечай душы. Робячы выснову пра мэтазгоднасць сваёй працы, пісьменнікі канстатуюць: «…Мы скончылі сваю доўгую працу з дзіўным пачуццём…: дзеля чаго ажывілі мы гэтых людзей, якія даўно сышлі, іх даўнія пакуты і боль? Мы многа разоў адказвалі сабе на гэтае пытанне, да канца не ведалі адказу, але ў адным мы сцвердзіліся: гэта трэба было зрабіць. Усё гэта было, і людзі, што жывуць, павінны пра гэта ведаць» [12, с. 429].

На погляд Т. Шамякінай, «І найцяжэйшая за ўсё на свеце – праўда», – так сказаў на схіле свайго жыцця Максім Танк. Зрэшты, ісціна гэта не новая. Яна хутчэй за ўсё старая як свет. Але сумленным людзям даводзіцца адкрываць яе кожны раз нанава і не проста спасцігаць, а выпакутаваць на ўласным, як правіла, горкім і балючым вопыце» [13, с. 108].

Сэнсам літаратурнага і грамадскага жыцця С. Алексіевіч спачатку было менавіта вызваленне чалавека ад залішняй ідэалагізацыі. Пастаўленая мэта вымагала глыбокага роздуму над працэсамі жыцця. Аўтар з'яўляецца членам Саюза пісьменнікаў Беларусі з 1983 года. За кнігі «У вайны не жаночае аблічча», «Апошнія сведкі» і «Чарнобыльская малітва» атрымала ў 1997 годзе прэмію «Трыумф». Нават калі меркаваць па тым, што створана пісьменніцай у літаратуры, журналістыцы, кінематаграфіі, то становіцца зразумелым – гэты таленавіты чалавек змагаўся з савецкай жорсткай ідэалагічнай структурай. Усё напісанае С. Алексіевіч успрымалася неадназначна. «Са з'яўленнем кніг «У вайны не жаночае аблічча» і «Цынкавыя хлопчыкі», – пісала В. Коўтун, – у нашым жыцці пачала перамагаць антываенная дэмакратыя» [14, с. 234].

Пасля выхаду ў свет першай кнігі «У вайны не жаночае аблічча» (1985) пісьменніца адразу стала вядомай. Яе ідэйным натхніцелем быў А. Адамовіч. Эпіграфам да кнігі сталі яго славутыя радкі: «У вайны не жаночае аблічча. Але нішто на гэтай вайне не запомнілася мацней, выразней, страшней і прыгажэй, чым абліччы нашых мацярок» [15, с. 7]. Пісьменніца імкнулася данесці да людзей праўду пра тое, што рабіла вайна з жанчынай, што жанчыны зрабілі дзеля перамогі. Цікавы факт – напісаць такую кнігу задумала маладая дзяўчына, журналістка, якая сама не зведала падобных трагедый. Нездарма Адамовіч у прадмове да кнігі напісаў: «Што і казаць, жанр бязлітасны… Паспрабуй прабіся з чужой бядой-турботай праз усе перашкоды-заслоны, якімі перакрыта душа чалавека… А прабіцца неабходна» [15, с. 4].

Толькі па мабілізацыі камсамола ў войска было накіравана каля пяцісот тысяч дзяўчат. Усяго ў розных відах войск на фронце служыла больш за васемсот тысяч жанчын. У Беларусі ў партызанскіх атрадах знаходзілася каля шасцідзесяці тысяч жанчын. Святлана Алексіевіч піша: «На самай страшнай вайне ХХ стагоддзя жанчыне давялося стаць салдатам… Жанчына забівала… «Не жаночая гэта доля – забіваць», – скажа адна з гераінь гэтай кнігі, умясціўшы сюды ўвесь жах і ўсю жорсткую неабходнасць таго, што здарылася» [15, с. 8].

Уяўленні і памяць пра вайну былі пераважна мужчынскія, таму і недастакова поўныя. Пісьменніцы ўдалося часткова ліквідаваць дадзены прабел. Сабрана амаль дзвесце аповедаў і сведчанняў жанчын-удзельніц гэтага страшэннага гвалту над чалавечай асобай: санінструктараў, лётчыц, сувязістак, сапёраў, снайпераў, стралкоў, дэсантніц, зенітчыц, радыётэлеграфістак, ваенфельчараў, шафераў, партызанак і г.д.

У кнізе таксама змешчаныя фатаздымкі дзяўчат і жанчын, што апавядалі пра вайну. Галоўную мэту стварэння дадзенай кнігі выразна акрэсліла адна з яе гераінь: «Вайну хочацца забыць, цяжка чалавеку жыць з такой жорстка нагружанай памяццю, з такой змучанай душой. Але што будзе з намі, калі яны забудуць і не перададуць нам сваю памяць? Якімі мы будзем без яе ў нашым вялікім і трывожным свеце?» [15, с. 270].

У адным з інтэрв'ю ў 1995 годзе С. Алексіевіч казала, што хоча напісаць сем кніг – своеасаблівую энцыклапедыю чалавечага жыцця. Ваенную тэму маюць тры з іх: «У вайны не жаночае аблічча», «Апошнія сведкі» і «Цынкавыя хлопчыкі». Апошняя адлюстроўвае вобраз вайны бязмэтнай, страту людзьмі свайго пакалення сэнсу жыцця і барацьбы.

Пісьменніца ўспамінае: «…З якой цяжкасцю… даводзілася прабіваць «крамольныя» думкі і раздзелы ў «Апошніх сведках», што сёння прызнаныя неаспрэчнымі» [14, с. 232]. Побач з іншымі творамі С. Алексіевіч дадзеная кніга была неадназначна ўспрынятая і сустрэтая крытыкай. Вайна стала біяграфіяй для цэлага пакалення дзяцей, таму ў літаратуры атрымаў развіццё асобны напрамак, звязаны з дзіцячым успрыманнем і атаясамліваннем падзей: «Калі дарослая памяць малюе ўзор, дае аб'емную карціну мінулага, перажытага, то дзіцячая выхоплівае найбольш яркія і трагічныя моманты» [16, с. 5].

Кніга «Апошнія сведкі» (1985) складаецца з аповедаў тых, хто ў гады вайны быў дзіцём ці падлеткам. Сёння яны, апошнія сведкі тых трагічных дзён, распавядаюць, як пазбавіліся дзяцінства і адразу сталі дарослымі. Вось толькі адзін успамін героя кнігі: «Не, дзіцём я не быў. Не памятаю сябе дзіцём…» [16, с. 169].

Тэма апаленага вайной дзяцінства для беларускай літаратуры не новая. Новай з'яўляецца форма выкладу дадзенага матэрыялу: мемуарная мастацка-дакументальная проза. Пісьменніца прызнаецца: «Чытач не заўсёды і здагадваецца, на якія згубы згаджаецца аўтар такой працы – у імя яго ж, чытача, інтарэсаў. Тры, пяць гадзін выслухоўвае тое, што і распавядаць, і слухаць пакутліва, а потым павінен яшчэ і рэзаць «па жывым», пакідаючы старонку, дзве ў тэксце будучай кнігі, але затое якія старонкі!» [16, с. 168].

Як ужо адзначалася, кнігі С. Алексіевіч сустракалі не толькі прыязны прыём. У іх знаходзіліся і нядобразычліўцы, бо кнігі адлюстроўвалі падзеі аб'ектыўна. Асабліва непрыязна была сустрэта кніга «Цынкавыя хлопчыкі», якая ўпершыню была надрукавана ў часопісе «Дружба народов» (1990). Пасля выхаду ў свет кнігі выявілася, што пісьменніца адкрыла адну відавочную ісціну: хлопцы выконвалі не інтэрнацыянальны абавязак, а з'яўляліся героямі бясслаўнай вайны. Самае цікавае тое, што негатыўную адзнаку яна атрымала з боку не толькі цэнзуры, але і маці воінаў-інтэрнацыяналістаў, і нават з боку саміх удзельнікаў вайны ў Афганістане. Алекссіевіч тлумачыла: «Я не суддзя таму, што ўбачыла і пачула. Я толькі хачу адлюстраваць свет чалавека такім, які ён ёсць. А сёння праўда пра вайну ўяўляецца шырэй, чым раней, як праўда пра жыццё і смерць наогул» [17, с. 202].

Праўда пра афганскую вайну ўскалыхнула грамадства. Рэакцыя чытачоў была неадназначнай, нават выклікала дыскусію на старонках часопіса «Дружба народов»: палярныя ацэнкі, розныя галасы – для ісціны яны ўсе цікавыя і роўныя. З дзённікаў да кнігі, апублікаваных у тым жа часопісе, чытач даведваецца пра душэўны стан пісьменніцы: «…Я не хачу больш пісаць пра вайну… Напэўна, у кожнага з нас ёсць свой запас абароны ад болю – фізічнага і псіхалагічнага. Мой быў вычарпаны дарэшты» [18, с. 5].

**Заключэнне.** У пошуках адказаў на пытанні сучаснасці беларуская літаратура пра вайну набывала дакладнасць. Гэта вяло да неабходнасці аднаўлення матэрыялу, выкарыстання адпаведных мастацка-выяўленчых сродкаў, мастацкаіх метадаў і прыёмаў, нарэшце, новых літаратурных жанраў. Адной з такіх форм максімальна праўдзівага адлюстравання ваенных падзей стала мемуарная мастацка-дакументальная проза. Варта адзначыць асаблівую сувязь дадзенай літаратуры з жыццём – не адцягненую. Таму актуальным падаецца выказванне І. Дзядкова наконт літаратуры такога кшталту: «…Гэта літаратура дакумента… Вытлумачаны і сцверджаны погляд больш справядлівы, чым які-небудзь іншы, погляд паслядоўна гуманнага мастака. Такі погляд разумее пачатак усяго і меру ўсяму – з чалавека» [5, с. 119].

## ЛІТАРАТУРА


1. Плоткин, Л. Литература и война: Великая Отечественная война в русской советской литературе / Л. Плоткин. – М.-Л.: Сов. писатель, 1967. – 357 с.
2. Андраюк, С.А. Чалавек на зямлі: Нарыс творчасці І. Пташнікава / С.А. Андраюк. – Мінск: Маст. літ., 1988. – 254 с.
3. Севярынец, П. Нацыянальная ідэя: фенаменалогія Беларусі / П. Севярынец. – Рыга: ОДО «Лайма», 2005. – 364 с.
4. Вторая мировая война в литературе зарубежных стран / П.М. Топер [и др.]; под общ. ред. П.М. Топера. – М.: Наука, 1985. – 616 с.
5. Литература о войне и проблемы века: сб. науч. ст. / НАН Беларуси; редкол.: А.М. Адамович (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 1986. – 271 с.

6. Шупенька, Г. Прага мастацкасці / Г. Шупенька. – Мінск: Маст. літ., 1996. – 461 с.
7. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддя: у 4 т. / рэдкал.: У.В. Гніламёдаў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – Т. 4: 1966 – 1985, 2004. – 928 с.
8. Адамович, А. Я из огненной деревни / А. Адамович, Я. Брыль, В. Колесник; под ред. А. Адамовича. – Минск: Маст. літ., 1977. – 464 с.
9. Дзюбайла, П.К. У пошуках духоўных каштоўнасцей: беларуская проза сёння / П.К. Дзюбайла. – Мінск: Навука і тэхніка, 1987. – 274 с.
10. Литература и современность. Сб. 20. Статьи о литературе 1982 года / Центр. науч. б-ка; науч. ред. – М.: Числов, 1983. – 391 с.
11. Литература великого подвига. Великая Отечественная война в советской литературе. Вып. 4 / Центр. науч. б-ка; редкол. Ю. Идашин (отв. ред.) [и др.]. – М., 1985. – 343 с.
12. Адамович, А. Блокадная книга / А. Адамович, Д. Гранин. – М.: Сов. писатель, 1982. – 432 с.
13. Шамякіна, Т. На лініі перасячэння: літаратурна-крытычныя нататкі / Т. Шамякіна. – Мінск: Маст. літ., 1981. – 143 с.
14. Коўтун, В. Феномен вернасці / В. Коўтун // Маладосць. – 1998. – № 5. – С. 232 – 234.
15. Алексіевіч, С. У вайны не жаночае аблічча / С. Алексіевіч. – Мінск: Маст. літ., 1991. – 272 с.
16. Алексиевич, С. Последние свидетели / С. Алексиевич. – М.: Молодая гвардия, 1985. – 175 с.
17. Гіль, М. Гжэчная мужнасць. Слова пра Святлану Алексіевіч / М. Гіль // Роднае слова. – 1998. – № 5. – С. 198 – 202.
18. Алексиевич, С. Цинковые мальчики. Из дневниковых записей для книги / С. Алексиевич // Дружба народов. – 1990. – № 7. – С. 5 – 88.

*Паступіў 20.06.2013*

**THE DISPLAY OF THE TRAGEDY OF HUMAN LIFE IN BELARUSIAN DOCUMENTARY FICTION NOVELLAS ABOUT WAR**

***T. BAGARADAVA***

*The documentary fiction prose texts, based on real events, are analysed. Approximately in 1960-s the study of the Great patriotic war as a people’s war became of a paramount importance for the Belarusian literature. Documentary literature gives a more upright and unbiassed analysis of the situation. The eyewitnesses of the burnt villages, the survivors of siege, the women-participants of the warfare, after all, the children, whose fates were mutilated by war, give the truthful picture of the reality of the time. Documentary texts about war , such as “I Am from a Burning Village” (by A. Adamovitch, J. Bryl, W. Kalesnick); “Book of a Siege” (by A. Adamovitch, D. Granin); “War does not have a woman's face”; “The last eyewitnesses”; “Zink box boys” (by S. Alexievitch). The experience given by literature shows us that in order to be a good judge of human nature one needs to take into account the real events of the past and the surroundings. The authors wanted to mirror terrible hostilities from different angles. Documentary fiction accomplishes to the limit the tasks set by the authors. The literary genre in question serves one of the highest purposes, notably, that of the truthful reflection of life.*